# К столетию создания БГУ

# Да стагоддзя стварэння БДУ

# Belarusian state university celebrates 100th anniversary

УДК (930.253:347.6):271/272

## РОЛЬ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА В ПРОЦЕССАХ ВОЗВРАЩЕНИЯ АРХИВНОГО НАСЛЕДИЯ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В 1920-х гг.

***А. Н. ЛАТУШКИН***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматривается история попытки возвращения в Беларусь архивов центральных органов власти Великого княжества Литовского в 1920-х гг. Приводятся сведения об их составе и структуре, анализируется оценка значения данной части архивного наследия представителями научной элиты того времени и государственного руководства республики. Делается вывод о близкой трактовке ценности комплекса оригиналов актов общегосударственного значения архива ВКЛ и архива канцелярии великих князей литовских – Метрики ВКЛ. Отражается решающая роль профессорско-преподавательского состава Белорусского государственного университета, в том числе его первого ректора профессора В. И. Пичеты, в возвращении белорусских архивов. Отмечается большой вклад представителей БГУ в разработку научной аргументации значения указанных архивных материалов для отечественной науки и культуры, введения этой тематики в учебный процесс БГУ.

***Ключевые слова:*** возвращение архивного наследия Беларуси; Великое княжество Литовское; архив канцелярии великих князей литовских; Метрика ВКЛ; комплекс оригиналов актов общегосударственного значения архива ВКЛ; государственный архив ВКЛ; Белорусский государственный университет; первый ректор БГУ профессор В. И. Пичета.

**Образец цитирования:**
Латушкін АМ. Роля Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў працэсах вяртання архіўнай спадчыны Вялікага Княства Літоўскага ў БССР у 1920-я гг. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;1:10–22.

**For citation:**
Latushkin AN. The role of the Belarusian State University in the processes of returning the archival heritage of the Grand Duchy of Lithuania in the 1920s. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;1:10–22. Belarusian.

**Автор:**
***Андрей Николаевич Латушкин*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры источниковедения исторического факультета.

**Author:**
***Andrei N. Latushkin***, PhD (history), docent; associate professor at the department of source study, faculty of history.
*archives@tut.by*

# РОЛЯ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА Ў ПРАЦЭСАХ ВЯРТАННЯ АРХІЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў БССР У 1920-я гг.

*А. М. ЛАТУШКІН* [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаецца гісторыя спробы вяртання ў Беларусь архіваў цэнтральных органаў улады Вялікага Княства Літоўскага ў 1920-я гг., прыводзяцца звесткі пра іх склад і структуру, аналізуецца ацэнка значэння названай часткі архіўнай спадчыны прадстаўнікамі тагачаснай навуковай эліты і дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі. Робіцца выснова аб блізкай трактоўцы каштоўнасці комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ і архіва канцылярыі (з 1566 г. – вялікай і малой канцылярый) вялікіх князёў літоўскіх – Метрыкі ВКЛ. Адлюстроўваецца вырашальная роля прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у тым ліку яго першага рэктара прафесара У. І. Пічэты, у вяртанні беларускіх архіваў. Адзначаецца значны ўнёсак прадстаўнікоў БДУ ў распрацоўку навуковай аргументацыі значэння названых архіўных матэрыялаў для айчыннай навукі і культуры, увядзення гэтай тэматыкі ў вучэбны працэс БДУ.

***Ключавыя словы:*** вяртанне архіўнай спадчыны Беларусі; Вялікае Княства Літоўскае; архіў канцылярыі вялікіх князёў літоўскіх; Метрыка ВКЛ; комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ; дзяржаўны архіў ВКЛ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; першы рэктар БДУ прафесар У. І. Пічэта.

# THE ROLE OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY IN THE PROCESSES OF RETURNING THE ARCHIVAL HERITAGE OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE 1920s

*A. N. LATUSHKIN* [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article examines the history of attempts to return the archives of the central authorities of the Grand Duchy of Lithuania to Belarus in the 1920s, provides information on their composition and structure, analyzes the significance of this part of the archival heritage in the views of representatives of the scientific elite and the state leadership of the republic. The conclusion is made about the close interpretation of the value of the complex of originals of acts of national importance of the Grand Duchy of Lithuania archive with the archives of the office of the Grand Duchy of Lithuania – the Metrics of the Grand Duchy of Lithuania. The decisive role in the problem of the return of the Belarusian archives of the teaching staff of the Belarusian State University is reflected, including its first rector, professor U. I. Picheta. Their great contribution to the development of the scientific argumentation of the significance of these archival materials for the domestic science and culture, introduction of this subject into the educational process of the Belarusian State University is noted.

***Key words:*** the restitucion of the archival heritage of Belarus; the Grand Duchy of Lithuania; the archives of the Grand Duchy of Lithuania; the Metric of the Grand Duchy of Lithuania; the complex of originals of acts of national importance of the Grand Duchy of Lithuania archive; the state archive of the Grand Duchy of Lithuania; the Belarusian State University; the first rector of the BSU professor U. I. Picheta.

## Уводзіны

Беларускі ўніверсітэт, створаны ў працэсах нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, распачатых падзеямі 1917 г. і рашэннямі Першага Усебеларускага з’езда, стаў не толькі навукова-адукацыйным цэнтрам, які ствараў кадравую аснову маладой рэспублікі. Ён адыгрываў вядучую ролю ў іншых, не менш важных кірунках станаўлення БССР. У прыватнасці, яго спецыялісты выступілі галоўнымі экспертамі ў справе вяртання архіваў, вывезеных з беларускіх зямель, у фарміраванні дзяржаўнага архіўнага фонду краіны. Асаблівая ўвага надавалася архіўнай спадчыне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (далей – ВКЛ). Гэта дзяржаўнае ўтварэнне разглядалася многімі вучонымі як адна з форм дзяржаўнасці беларускага народа. У яе структуры ключавое месца належыць двум аб’ектам – дзяржаўнаму архіву Вялікага Княства Літоўскага (архіў ВКЛ) і Метрыцы ВКЛ. Аснову дзяржаўнага архіва ВКЛ складаў комплекс арыгіналаў найважнейшых прававых актаў агульнадзяржаўнага значэння, месцам захоўвання якіх першапачаткова выступаў земскі скарб, а з другой паловы XVII ст. для часткі актаў пераважна канца XIV – пачатку XVII ст. – прыватныя архівы рода Радзівілаў. Ён

уключаў некалькі груп дакументаў, сярод якіх найбольш буйнымі былі наступныя:

1) агульназемскія прывілеі ВКЛ;

2) міравыя пагадненні паміж ВКЛ і вялікімі князямі маскоўскімі, гаспадарамі малдаўскімі і іншыя дамовы знешнепалітычнага характару;

3) акты уній ВКЛ і Каралеўства Польскага;

4) дакументы аб зносінах вялікіх князёў літоўскіх з Ватыканам [1].

Адначасова існаваў архіў вялікай і малой канцылярый ВКЛ, які ўтвараў так званую Метрыку ВКЛ[1].

Існуе пэўная спецыфіка разгляду тэмы вяртання комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ у савецкі перыяд. База ведаў менавіта аб комплексе арыгіналаў як часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ і ўласна самім архіве фарміравалася ў Беларусі павольна. Да пачатку XX ст. аб лёсе дакументаў названага збору, якія захоўваліся Радзівіламі, было вядома надзвычай мала. Сістэматычна распрацоўвацца гэта тэма пачала толькі пасля вяртання часткі комплексу ў Нясвіж (1902). Адметна, што ля вытокаў яе гістарыяграфіі стаяў даследчык менавіта Метрыкі ВКЛ – С. Пташыцкі (1853–1933) [3]. Належная навуковая распрацоўка праблемы разгарнулася ў 1920-я – пачатку 1930-х гг. і была прадстаўлена ў працах згаданага вучонага, а таксама С. Кутшэбы (1876–1946), У. Сямковіча (1878–1949) і Я. Якубоўскага (1874–1938) [4]. Першыя беларускія публікацыі па архівазнаўчым аспекце тэмы з'явіліся толькі ў канцы XX ст. Гэтым можа тлумачыцца тое, што ў айчынных крыніцах і гістарыяграфіі вяртання беларускіх архіваў 1917–1991 гг. комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ як канкрэтна акрэслены не фігуруе. Ён згадваецца ў кантэксце найбольш знакамітых, але асобных актаў ці іх відаў (акты Гарадзельскай уніі 1413 г., Люблінскай уніі 1569 г., агульназемскія прывілеі).

У сувязі з вышэйадзначаным праблему мэтазгодна разглядаць комплексна: у межах мерапрыемстваў па вяртанні Метрыкі ВКЛ як архіва цэнтральнага органа кіравання (так званай вялікай і малой канцылярый княства), найбольш буйнога і поўнага масіву крыніц па гісторыі функцыянавання дзяржавы і яе інстытутаў. З улікам заяўленага тагачаснымі айчыннымі спецыялістамі высокага гісторыка-культурнага значэння Метрыкі ВКЛ, якая пераважна складалася з копій тэкстаў арыгінальных дакументаў, занесеных у асобныя кнігі (першапачаткова – сшыткі), можна з упэўненасцю сцвярджаць, што комплекс уласна арыгіналаў дзяржаўных прававых актаў таксама знаходзіўся ў сістэме крытэрыяў вызначэння яе каштоўнасці пры разглядзе пытання вяртання архіўнай спадчыны Беларусі ў савецкі перыяд. Акрамя таго, мяркуючы па тэрміналогіі і трактоўках, якія ўжываліся ў дачыненні да Метрыкі ВКЛ ў 1920-я гг., менавіта яна тады ўспрымалася як галоўны архіў дзяржавы, дзяржаўны архіў ВКЛ. Стаўленне да Метрыкі ВКЛ навуковых дзеячаў БССР, агульныя трактоўкі значэння помніка для Беларусі ўказваюць менавіта на такія ўяўленні аб ім[2]. Таксама дадаткова намі прымаецца пад увагу пытанне вяртання дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў, таму што менавіта ў яго складзе комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння захоўваўся амаль да канца Другой сусветнай вайны, пасля чаго ён разам з дадзеным прыватным зборам трапіў у Галоўны архіў старажытных актаў Польшчы ў Варшаве (Archiwum Główny Akt Dawnych)[3].

## Асноўная частка

Выключна важнае месца ў працэсах вяртання архіваў у Беларусь на ранніх этапах гісторыі БССР займае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Першы рэктар БДУ У. І. Пічэта (1878–1947) даказваў гістарычнае права Беларусі на адну з найважнейшых частак архіўнай спадчыны ВКЛ як дзяржа-

---

[1]Адносна тэрміналогіі па разглядаемай тэме і, у прыватнасці, адносна зместу тэрміна «дзяржаўны архіў ВКЛ», умоў распаўсюджвання яго на Метрыку ВКЛ аўтар тут прытрымліваецца падыходу А. Я. Рыбакова: дзяржаўны архіў ВКЛ складаўся з «сапраўдных» (арыгіналаў) актаў агульнадзяржаўнага значэння і маёмасна-прававых актаў на вымарачныя ўладанні; Метрыка ВКЛ першапачаткова мела характар ведамаснага архіва, тэрмін «дзяржаўны архіў» апраўданы ў адносінах да яе толькі па стане на канец XVIII ст. пры ўмове страты «сапраўдных» актаў дзяржаўнага архіва ВКЛ [2, с. 74–76]. Існаванне і самастойнасць двух названых архіваў у першай трэці XVIII ст. даказваюць наступныя крыніцы: «Архіў Вялікага Княства Літоўскага» (арыгіналы актаў унутры- і знешнепалітычнага характару) і «Архіў Метрыкі в(ялікай) (?) канцылярыі ВКЛ»: Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD). Zespół № 354. Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski (AR). Dział II. Dokumenty historyczne. Sygn. 2460. Regestr Pact, Hramot, Correspondentyi… 1729.06.01. S. 15, 21.

[2]У крыніцах разглядаемага перыяду каштоўнасць Метрыкі ВКЛ пераважна трактуецца з крыніцазнаўчага пункта гледжання: яна лічылася самым багатым комплексам інфармацыі аб мінулым Беларусі. Разам з тым М. В. Доўнар-Запольскі называў Метрыку ВКЛ «архівам цэнтральнай канцылярыі Вялікага Княства Беларуска-Літоўскага» [5, с. 520]. Тым самым вучоны, як падаецца, атаясамліваў яе з галоўным архівам дзяржавы (дзяржаўным архівам?). Ёсць падставы сцвярджаць, што інтэлектуальнай эліце, ураду БССР у 1920-я гг. было вядома такое разуменне Метрыкі ВКЛ. У згаданы час так яго фармулявала Літва: сярод матэрыялаў Наркамата асветы БССР маецца пераказ пазіцыі Літоўскага ўрада адносна сваіх правоў на Метрыку ВКЛ у 1927 г. (?) у форме непадпісанай запіскі ад 16 сакавіка, накіраванай ва Упраўленне справамі СНК БССР: «Прадстаўнік Літоўскага Ураду сваё патрабаваньне выказаў у наступнай форме: "Літоўская метрыка *як урадавы архіў Вялікага княства Літоўскага*, які мае велізарнае значэньне для літоўскага народу, бо зьяўляецца *адзіночнай* (тут і далей курсіў наш. – *А. Л.*) крыніцай для вывучэньня яго гістарычнага лёсу ў XV–XVIII вякох, павінен быць цалкам зьвернут ураду Літоўскай Рэспублікі"» (тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала. – *А. Л.*) [6, с. 97].

[3]AGAD. Zespół № 354 AR. Dział I. Dokumenty pergaminowe; Zbiór dokumentów pergaminowych.

вы – Метрыку ВКЛ . Ён называў яе найвялікшым помнікам беларускай мовы і культуры[4]. Пазіцыя абароны Метрыкі ВКЛ ад перадачы яе Польшчы або Літве была занята ім у 1920–1921 гг. і 1923–1924 гг., калі У. І. Пічэта выступаў экспертам з савецкага боку пры выпрацоўцы і рэалізацыі палажэнняў Маскоўскай дамовы аб міры паміж РСФСР і Літвой ад 12 ліпеня 1920 г. (артыкул IX) і Рыжскай мірнай дамовы ад 18 сакавіка 1921 г. (артыкул XI). Дадзены факт дзеяч з гонарам адзначаў у адной са сваіх аўтабіяграфій: «Осенью 1920 г. принимал участие в переговорах с Литвой и Польшей по реализации Московского и Рижского договоров и сумел научными доказательствами обосновать невыдачу Литовской метрики, из-за которой шла борьба» [8, с. 49]. Больш за тое, ва ўмовах адсутнасці на перамовах у Рызе прадстаўніцтва ад Беларусі пункт гледжання аб этнаграфічнай адметнасці беларусаў і дзяржаўнай самастойнасці беларускіх зямель у перыяд ВКЛ адстойваў разам з калегамі менавіта У. І. Пічэта [8, с. 62–63]. Рашучую пазіцыю абароны архіўнай спадчыны ВКЛ ад перадачы Польшчы або Літве вучоны займаў і пазней, ва ўстановах і органах улады РСФСР. Фактычна ён аказаўся адным з нямногіх дзеячаў ва ўладных структурах Расіі, кім у тых надзвычайных умовах былі забяспечаны інтарэсы ўласна беларускага народа. Вядома, што ў той самы час асобныя прадстаўнікі ўрада Расіі па названых пытаннях у перамовах паводзілі сябе пасіўна, што было, хутчэй, на карысць Польшчы, чым савецкай дзяржаве [8, с. 67, 70–73, 75, 76; 9, с. 69–76]. Менавіта зыходзячы з гэтага, а таксама ўлічваючы працэс паступовага зварочвання беларусізацыі, разгортвання барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, а таксама распачатай кампаніі супраць найбольш актыўнага барацьбіта за вяртанне Метрыкі ВКЛ М. В. Доўнар-Запольскага, варта падыходзіць да трактоўкі сцвярджэння У. І. Пічэты, якое зафіксавана ў адной з яго аўтабіяграфій у 1926 г.: «Мой образ действий исключительно имел в виду интересы РСФСР» [8, с. 68].

Сваю пазіцыю У. І. Пічэта даказваў і як рэктар БДУ. Пасля пераезду ў Мінск вучоны значна садзейнічаў арганізацыі архіўнай справы Савецкай Беларусі, шчыра вітаў стварэнне Цэнтрархіва БССР, характарызаваў гэту падзею як эпахальную ў газеце «Савецкая Беларусь» ад 31 студзеня 1924 г. [8, с. 212; 10]. Вучоны быў адным з найбольш аўтарытэтных і кампетэнтных удзельнікаў Першай Усебеларускай канферэнцыі архіўных работнікаў (12–15 мая 1924 г.) у Мінску. Выступленні рэктара БДУ як былога прадстаўніка Цэнтрархіва РСФСР на канферэнцыі таксама былі прысвечаны тэме Метрыкі ВКЛ[5]. У выніку канферэнцыя адзінагалосна прыняла дзве рэзалюцыі аб вяртанні архіваў, вывезеных з Беларусі ў дарэвалюцыйны час і ў часы акупацый, у тым ліку накіраваную супраць выдачы «архіваў Літоўскай метрыкі» Польшчы, Літве або іншым дзяржавам[6].

Заслугі першага рэктара БДУ па абароне інтарэсаў Беларусі ў пытаннях вырашэння лёсу архіўнай спадчыны ВКЛ у першай палове 1920-х гг., вызначэнні дзяржаўнай прыналежнасці Метрыкі ВКЛ высока ацэньваліся ў краіне, што адзначаюць і спецыялісты. Так, удзельнікамі Першай Усебеларускай канферэнцыі архіўных работнікаў была выказана падзяка У. І. Пічэту «за адстаіваньне беларускіх архіваў» (цыт. па [12, с. 23]). Дзейнасць вучонага па абароне Метрыкі ВКЛ на ўзроўні міжнародных адносін была працягнута і пазней. У 1925 г. рэктар БДУ прадстаўляў пазіцыю Беларусі па пытанні Метрыкі ВКЛ на IV з’ездзе польскіх гісторыкаў (6–9 снежня 1925 г., г. Познань), удзельнікі якога ў чарговы раз выступілі з заявай аб перадачы яе Польшчы [8, с. 139]. Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь таксама сведчаць, што менавіта на аснове паведамлення У. І. Пічэты СНК БССР 9 лістапада 1926 г. падрыхтаваў зварот у Наркамат замежных спраў СССР (аддзел Прыбалтыкі) з просьбай «воздержаться от передачи Литве *так называемой Литовской* метрики» [6, с. 96]. Гэта была рэакцыя на адпаведны зварот урада Літвы да СССР з патрабаваннем перадачы Метрыкі ВКЛ.

Пытанні архіўнай спадчыны ВКЛ і, у прыватнасці, яе прававых помнікаў, распрацоўваліся і ў межах БДУ. У другой палове 1920-х гг. яны ўваходзілі ў тэматыку даследаванняў у аспірантуры ўніверсітэта. Пад навуковым кіраўніцтвам У. І. Пічэты маладымі

[4]«Величайшим памятником белорусского языка и культуры является архив канцелярии великого князя литовского, известный под именем “Литовской метрики”, в котором сохранились акты и книги, включающие грамоты и документы, написанные по установленной в государственной канцелярии форме. Литовская метрика – собрание чрезвычайной ценности, на основе которого можно восстановить быт, культуру белорусского народа, экономическую и социальную структуру общества» [7, с. 647–648].

[5]У 1918–1923 гг. У. І. Пічэта займаў пасаду галоўнага інспектара Цэнтрархіва РСФСР [8, с. 48, 51; 11, с. 34–36].

[6]«Заслухаўшы даклад праф. У. І. Пічэты аб уплыву дагавораў РСФСР з утварыўшыміся дзяржавамі на стан беларускіх архіваў і прымаючы пад увагу вялікую значнасьць Літоўскай метрыкі *як* асноўнага грунтоўнага гістарычнага матэрыялу, застаўшагася ад мінулых часоў *Беларускай дзяржавы*, без якога не магчымы навуковыя высьляды мінулага Беларусі, а гэтак сама значнасьць другіх беларускіх каштоўных архіўных матэрыялаў, на якія пратандавалі і пратандуюць занава ўтварыўшыяся дзяржавы, нарада архіўных працаўнікоў БССР знаходзіць патрэбным даручыць Цэнтрархіву БССР зьвярнуцца ў ЦВК СССР аб недапушчэньні вывазу беларускіх архіўных матэрыялаў з тэрыторыі СССР у Польшчу, Латвію, Літву і др. дзяржавы і прыняць меры аб звароце на Беларусь архіўных матэрыялаў, якія былі вывезены з Беларусі ў дарэвалюцыйны час і ў часы розных акупацый. <...> Нарада пастанаўляе: 1) прызнаць неабходным усе архівы, якія вывезены з тэрыторыі этнографічнай Беларусі, зьвярнуць у Цэнтрархіў БССР...» [11, с. 52, 54].

беларускімі вучонымі вывучалася тэма «Прывілеі Вялікага Княства Літоўскага», а таксама іншыя пытанні, прысвечаныя заканадаўству ВКЛ. Гэта тэма знаходзіла навуковае ўвасабленне ў курсах гісторыі Беларусі, крыніцазнаўства, гісторыі права Беларусі. Два апошнія з названых курсаў выкладаліся самім рэктарам на педагагічным факультэце і факультэце грамадскіх навук [10, с. 90, 91; 13, с. 296–298]. Вядома таксама, што ў сярэдзіне 1920-х гг. У. І. Пічэта праводзіў семінар па вывучэнні Першага Статута ВКЛ. Яго аўтарству належыць праца «Крыніцы беларускага права» (1925), значэнне і якасць якой высока ацэньвалася сучаснікамі [8, с. 171, 181].

Разам з У. І. Пічэтам у 1920-я гг. вывучэннем помнікаў беларускага права і пытаннем вяртання Метрыкі ВКЛ займаліся і іншыя знакамітыя вучоныя: доктар гістарычных навук прафесар БДУ М. В. Доўнар-Запольскі, дацэнты Д. І. Даўгяла, В. Д. Дружчыц, загадчык кафедры этнаграфіі БДУ І. А. Сербаў і інш.

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867–1934) – прафесар кафедры гісторыі Беларусі педагагічнага факультэта і кафедры народнай гаспадаркі Расіі факультэта права і народнай гаспадаркі БДУ (з 1 кастрычніка 1925 г.) [14, с. 94][7]. Узровень і маштаб навукова-даследчай і арганізатарскай дзейнасці вучонага, яе беларуская скіраванасць дазваляюць аднесці яго да заснавальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі. Памяць аб ім у наш час актыўна адраджаецца і ўшаноўваецца [5; 14–16]. М. В. Доўнар-Запольскі быў самым непасрэдным чынам звязаны з гісторыяй стварэння ў Беларусі ўніверсітэта ў XX ст. Адметна, што сярод прыярытэтных задач па адкрыцці ў Мінску такой навучальнай установы ён бачыў, між іншым, фарміраванне бібліятэкі, збор і ахову архіваў, высвятленне лёсу эвакуіраваных з Беларусі дакументальных каштоўнасцей [13, с. 34]. Яшчэ на пачатковым этапе сваёй навуковай дзейнасці, працуючы ў Маскоўскім архіве Міністэрства юстыцыі, М. В. Доўнар-Запольскі стаў добра вядомай асобай сярод спецыялістаў па Метрыцы ВКЛ, знаўцам архіўнай «альбарутэнікі» ў замежных сховішчах. Пасля прыезду ў БССР у другой палове 1925 г. і прызначэння на пасаду кіраўніка Гісторыка-археалагічнай камісіі Інстытута беларускай культуры ён фактычна з першых дзён сваёй працы актыўна даказвае неабходнасць вывучэння і навуковай публікацыі кніг Метрыкі ВКЛ як справы агульнанацыянальнага значэння [5, с. 569–570]. Яго артыкул у газеце «Савецкая Беларусь» аб каштоўнасці Метрыкі ВКЛ утрымліваў ключавыя ідэі, якія падкрэслівалі высокую навуковую і гісторыка-культурную каштоўнасць гэтага комплексу крыніц у працэсах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР. Вучоны лічыў, што згаданая каштоўнасць выражалася ў наступным: «Перш за ўсё справа ў тым, што мы ня можам ня ведаць свайго мінулага, што мы павінны вывучыць яго. Мы – народ малады, ці, лепей кажучы, памаладзеўшая нацыя. Рэвалюцыя зьвярнула нам права на самавызначэньне, што зьяўляецца адным з найвялікшых рэвалюцыйных здабыцьцяў, якімі мае магчымасьць карыстацца былўшы прыгнечаны беларускі народ. Але мы павінны гэта права ўзмацніць. Пашыраючы вывучэньне гісторыі Беларусі, мы яшчэ больш, яшчэ глыбей высьветлім для сябе гэта свае права на самавызначэнне. У нашых руках будзе больш аргументаў, каб даць адпор і нашым ворагам і няпрыхільнікам і адхіліць іхныя напады. Літоўская мэтрыка – найбагацейшая крыніца гістарычных ведаў аб мінулым Беларусі. Крыніца гэта ўваскрашае перад намі багатую культуру старой Беларусі, яе прававыя падставы, яе сацыяльную і эканамічную структуру. Тут гісторыя беларускага сялянства, тут гісторыя барацьбы мяшчан з шляхтай, тут гісторыя нашай старой канстытуцыі, тут гісторыя змаганьня беларускага народу за сваю свабоду і за сваю культуру. <…> У *беларускай дзяржаве* юрыдычная думка была высока разьвіта. Мова беларускіх юрыдычных актаў – строга азначаная і добра характарызуе кожнае юрыдычнае пытаньне. Гэткай якасьцю мовы тлумачыцца і сьцісласьць выразаў актавага матэр'ялу мэтрыкі. Усё гэта – такія якасьці гісторыка-юрыдычнага матар'ялу, якія робяць яго са ўсіх бакоў матар'ялам выключным» [17].

Менавіта праз пазіцыю па Метрыцы ВКЛ можна меркаваць і пра пазіцыю М. В. Доўнар-Запольскага адносна комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ як атрыбута дзяржаўнасці, які займае цэнтральнае месца ў архіўнай спадчыне Беларусі перыяду канца XIV – XVIII ст. Так, Метрыку ВКЛ вучоны трактаваў у абодвух сэнсах адназначна станоўча: «У цяперашні час (1925 г. – *А. Л.*) літоўская мэтрыка знаходзіцца ў Маскве. Але з часам яна пяройдзе ў распараджэньне БССР. Метрыка, бязумоўна, вернецца да нас. Помнік *былой самастойнасьці* беларускага народа *будзе захоўвацца ў нас*» [17].

Дзейнасць М. В. Доўнар-Запольскага ў пытаннях вяртання архіваў з Расіі на Беларусь знаходзіла і практычнае выражэнне. 18 верасня 1925 г. была прынята пастанова Прэзідыума ЦВК СССР аб задавальненні хадайніцтваў ЦВК Беларускай ССР і Украінскай ССР аб вяртанні архіваў з РСФСР і стварэнні адпаведнай сумеснай камісіі з прадстаўнікоў зацікаўленых бакоў. Ад БССР у камісію дэлегавалася кіраўніцтва Цэнтраархіва. У пачатку кастрычніка 1925 г. для «выяўлення архіўных матэрыялаў, якія

[7]Згодна з інфармацыяй В. М. Лебедзевай, з верасня 1925 г. – загадчык кафедры гісторыі народнай гаспадаркі БДУ [5, с. 19]. Паводле А. У. Унучака, пасля прыезду ў Мінск – прафесар кафедр гісторыі гаспадарчага побыту Еўропы і гісторыі народнай гаспадаркі СССР БДУ [15, с. 41].

належаць да БССР і знаходзяцца ў архівах РСФСР» [5, с. 570, 571], і забеспячэння беларускага боку інфармацыяй для заявак на вяртанне дакументаў пры Народным камісарыяце асветы БССР была створана камісія. У склад камісіі сярод іншых увайшоў і М. В. Доўнар-Запольскі ў якасці намесніка старшыні. Яго секцыяй быў падрыхтаваны зварот да Прэзідыума Інстытута беларускай культуры па справе вяртання Метрыкі ВКЛ [5, с. 570, 571]. У лістападзе таго ж года вучоны прадстаўляў інтарэсы Беларусі на пасяджэннях падкамісіі пры камісіі ЦВК СССР. Яго дзейнасць даследчыкі характарызуюць як надзвычай актыўную і плённую [14, с. 96]. Вучонаму ўдалося атрымаць папярэднюю згоду адпаведных органаў і ўстаноў РСФСР і СССР на вяртанне Метрыкі ВКЛ («признать принципиально возможным») (цыт. па [9, с. 98]). Аднак у названы перыяд гэтага не адбылося[8]. У цэлым можна заўважыць, што тэма Метрыкі ВКЛ – абарона ад прэтэнзій Польшчы і Літвы, вяртанне ў навуковы і культурны кантэкст беларусаў, доказ яе значэння для працэсаў дзяржаўнага будаўніцтва БССР, абгрунтаванне мэтазгоднасці падрыхтоўкі навуковай публікацыі Інбелкультам – выступіла ці не галоўнай «місіяй» М. В. Доўнар-Запольскага ў перыяд яго працы на Беларусі, адным з самых важкіх яе вынікаў. Вядома, што пасля высылкі з краіны яго справу па вывучэнні Метрыкі ВКЛ пры Гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта прадоўжыў У. І. Пічэта[9].

Крыніцамі пацвярджаецца і непасрэднае дачыненне М. В. Доўнар-Запольскага да праблемы комплексу арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва ВКЛ. Вядома, што падчас сваёй дзейнасці пры Гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта вучоным быў падрыхтаваны да друку падручнік для семінарый пад назвай «Агульнадзяржаўныя прывілеі Беларусі» [8, с. 226]. Гэты факт можа сведчыць аб уключэнні згаданага пытання ў вучэбны працэс БДУ як самастойнай адзінкі, а таксама ўказвае на атаясамленне вучоным ВКЛ і Беларусі: «Агульнадзяржаўныя прывілеі *Беларусі*». На жаль, звесткі аб пазнейшым лёсе падручніка адсутнічаюць [16].

Гісторык, архівіст, археограф Д. І. Даўгяла (1868–1942) у якасці дацэнта педагагічнага факультэта БДУ з 1925 г. выкладаў курс крыніцазнаўства гісторыі Беларусі. Па гэтай дысцыпліне вучоным былі напісаны дзве працы: «Гісторыя крыніц беларускай гісторыі і крыніцазнаўства» і «Крыніцы па беларускай гісторыі і крыніцазнаўстве» [18, с. 146–149]. Ён высока ацэньваў Метрыку ВКЛ і ідэі, сфармуляваныя М. В. Доўнар-Запольскім. Сумесна з ім у якасці сакратара Гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта Д. І. Даўгяла выступае фактычна ва ўсіх яго пачынаннях. Права Беларусі на гэты ўнікальны масіў крыніц рашуча адстойвалася вучоным на Першым з'ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, арганізаваным Інстытутам беларускай культуры ў студзені 1926 г. Тэма была развіта вучоным і прадстаўлена на з'едзе ў форме даклада пад назвай «Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі» [18, с. 77–78; 19, с. 53–59]. На аснове матэрыялаў С. Пташыцкага, М. В. Доўнар-Запольскага, а таксама ўласнага вопыту вывучэння дадзенага масіву крыніц Д. І. Даўгяла прадставіў гісторыю захоўвання Метрыкі ВКЛ, яе склад, ахарактарызаваў гісторыю яе археаграфічнай апрацоўкі і абгрунтаваў патрэбу яе выдання. Важнасць крыніцы вучоны падкрэсліваў тым, што толькі з вывучэннем Метрыкі ВКЛ «пачала існаваць *навуковая* гісторыя беларускага народу» [19, с. 58].

Даклад Д. І. Даўгялы лёг у аснову рэзалюцый з'езда аб вяртанні Метрыкі ВКЛ і дзяржаўнай праграме яе публікацыі. Адметна, што менавіта названы археаграфічны кірунак працы пасля з'езда становіцца асноўным у прафесійнай дзейнасці вучонага. М. Ф. Шумейка, вядучы айчынны даследчык гісторыі архіўнай справы на Беларусі, біёграф Д. І. Даўгялы, адзначае: «Для Д. И. Довгялло съезд стал своеобразной вехой, знаменовавшей его окончательный поворот к проблемам национальной археографии, важнейшей составляющей которой являлись изучение и публикация документов Метрики Великого княжества Литовского» [18, с. 80]. Тэкст даклада, агучанага на з'ездзе Д. І. Даўгялам, з пэўнымі зменамі быў апублікаваны на старонках афіцыйнага выдання «Савецкая Беларусь». Гэты матэрыял разам з артыкуламі М. В. Доўнар-Запольскага стварылі ў перыядычным друку Беларусі 1925–1926 гг. агульную серыю публікацый, прысвечаных Метрыцы ВКЛ [20]. Названы даклад пазней неаднаразова перавыдаваўся і стаў своеасаблівым «штандарам» ідэі вяртання Метрыкі ВКЛ, адным з найбольш вядомых па разглядаемай тэме ў айчыннай гістарыяграфіі міжваеннага перыяду, хоць сам Д. І. Даўгяла не адносіў яго да галоўных сваіх прац [18, с. 80; 21].

Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі 1926 г. для развіцця разглядаемай тэмы мае самастойнае значэнне. Пытанне правоў Беларусі на Метрыку ВКЛ выступала на ім адным

[8]Падрабязней пра гісторыю рэалізацыі пастановы Прэзідыума ЦВК СССР ад 18 верасня 1925 г. аб дзейнасці камісіі па вяртанні беларускіх архіваў з РСФСР гл. працу М. Ф. Шумейкі [9, с. 94–102].

[9]«20 кастрычніка [1926 г.] адбылося пасяджэньне гістарычна-архэолёгічнай камісіі Інбелкульта, на якім абгаворваўся план працы сэкцыі на бягучы акад. год. На пасяджэньні пастаноўлена прадоўжыць пад кіраўніцтвам праф. У. І. Пічэты і дац. В. Дружчыца вывучэньне Літоўскай мэтрыкі…» («Савецкая Беларусь», 1926 г., 28 кастрычніка) (цыт. па [8, с. 226]).

з асноўных. Патрэба правядзення з'езда была шмат у чым абумоўлена знешнімі фактарамі, а менавіта актывізацыяй у 1925 і 1926 г. прэтэнзій Польшчы і Літвы на атрыманне Метрыкі ВКЛ. Як адзначалася вышэй, у снежні 1925 г. IV з'езд польскіх гісторыкаў выказаў патрабаванне «вяртання» гэтага комплексу крыніц Польшчы. Тое ж патрабаванне было адной з умоў Літвы пры заключэнні дамовы з СССР аб ненападзе і мірным вырашэнні канфліктаў (падпісана 28 верасня 1926 г.) [14, с. 95]. Падтрымка з'езда была прадэманстравана вышэйшым кіраўніцтвам рэспублікі. Яго ганаровымі старшынямі з'яўляліся старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў, старшыня СНК БССР Я. А. Адамовіч, першы сакратар ЦК КП(б)Б А. І. Крыніцкі і інш. Намеснік народнага камісара асветы А. В. Баліцкі ў вітальным слове адзначаў: «Адным з цікавейшых помнікаў з'яўляецца Літоўская Мэтрыка, якая знаходзіцца ў Маскве. Польшча дамагаецца ад СССР, каб гэты наш помнік забраць да сябе. Мы павінны заявіць тут, што гэты помнік старасьветчыны – наш, і *толькі Беларуская Савецкая ўлада* мае на яго права» [19, с. 8].

Вядучая роля на з'ездзе належала прадстаўнікам БДУ. Адметна, што праблема вяртання архіваў удзельнікамі з'езда напрамую звязвалася з навукова-даследчымі і адукацыйнымі патрэбамі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама Інстытута беларускай культуры – будучай Акадэміі навук Беларусі. Гэты падыход быў агучаны пры адкрыцці з'езда ў прывітальным слове ад імя БДУ, зачытаным дацэнтам, правадзейным членам Інстытута беларускай культуры В. Д. Дружчыцам (1886–1937): «У мінулым Беларусь мела свой універсітэт у Вільні. У пачатку (XVI ст.) гэта была акадэмія езуіцкая, а затым універсітэт шляхоцкі. Такім ён застаўся да самага зачыненьня ў 1832 г. З Кастрычніцкай рэвалюцыяй, калі рабочыя і сяляне ўзялі ўладу ў свае рукі, адчынілі сваю вышэйшую школу, якая павінна падрыхтаваць рабоча-сялянскую інтэлігенцыю. Падрыхтоўка, аднак, сустракае значныя перашкоды. Гэтыя перашкоды ляжаць у вадсутнасці сталых і належна распрацаваных навуковых падручнікаў, якія высьвятляюць прыродныя, гаспадарчыя, эканомічныя і гістарычныя веды аб Беларусі. Жаданьне Інбелкульту – сабраць крыніцы, падлічыць вынікі зробленага, пачаць плянавую працу ў археолёгіі і, разам з гэтым, высьветліць, дзе знаходзяцца архіўныя весткі. Грунтаваньне іх на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца выжным момантам для гістарычнай навукі Беларусі, асабліва для тых новых дасьледчыкаў, якіх рыхтуе Беларускі Дзяржаўны Універсітэт…» [13, с. 222–223; 19, с. 10].

З'езд 1926 г. быў больш катэгарычным у сваіх патрабаваннях адносна лёсу архіўнай спадчыны краіны, і, у прыватнасці, той яе часткі, што адносіцца да перыяду ВКЛ. Акрамя Д. І. Даўгялы, гэту тэму закраналі ў сваіх дакладах і выступленнях М. В. Доўнар-Запольскі, В. Д. Дружчыц, Я. І. Васілевіч і інш. [19, с. 10, 11, 31–52]. Фактычна на аснове дакладаў і выступленняў прадстаўнікоў БДУ з'ездам больш востра было пастаўлена пытанне вяртання ў Беларусь з РСФСР, Украіны, Польшчы архіўных матэрыялаў айчыннага паходжання, звароту музейных і бібліятэчных каштоўнасцей. Рэзалюцыя № 1 з'езда датычылася менавіта Метрыкі ВКЛ. У адрозненне ад падзей 1924 г., калі прыярытэтам для кіраўніцтва архіўнай галіны БССР было недапушчэнне страты гэтага масіву крыніц для СССР, рэзалюцыя Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі 1926 г. ужо выразна патрабавала «як найхутчэй перавезьці архіўны фонд Метрыкі Літоўскай у БССР». Аб частцы Метрыкі ВКЛ, якая апынулася ў іншых установах, напрыклад у архіве Міністэрства замежных спраў, згадвае другая рэзалюцыя [19, с. 5–6]. Акрамя таго, калі ў 1924 г. рэзалюцыі аб вяртанні архіваў датычыліся пераважна перамяшчэнняў перыяду 1915–1920 гг., то зараз размова ішла таксама аб фондах і дакументах, якія маглі трапіць у сховішчы Ленінграда, Масквы і іншых гарадоў Расіі ў ранейшыя перыяды айчыннай гісторыі. Такія дакументы былі згаданы ў выступленні М. В. Доўнар-Запольскага «Старыя Беларускія архівы за межамі Беларусі» [19, с. 31–52]. На ім варта спыніцца асобна.

У названым дакладзе вучоны ўпершыню называе акты з комплексу арыгіналаў дзяржаўнага архіва ВКЛ і адносіць іх да архіўнай спадчыны Беларусі. Аўтар прыводзіць каштоўны аналіз дакументаў, якія былі ім выяўлены за перыяд навукова-даследчай працы ў буйных дакументальных сховішчах Ленінграда, Масквы, Вільні, Варшавы, Львова, Кракава. Сярод рукапісных фондаў публічнай бібліятэкі ў Ленінградзе (цяпер – Расійская нацыянальная бібліятэка, далей – РНБ) вучоны называе групу матэрыялаў па сацыяльна-палітычнай, ваеннай, эканамічнай гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай XV–XVIII стст. [19, с. 31–36]. У фондзе лацінскіх рукапісаў М. В. Доўнар-Запольскім быў выяўлены зборнік з копіямі агульназемскіх прывілеяў ВКЛ і іншых дзяржаўна-прававых актаў за перыяд 1413 г. – не пазней за 1587 г. Зборнік быў створаны ў перыяд кіравання Стэфана Баторыя і ўяўляў сабой афіцыйна завераную копію актаў названага віду. Параўнанне спісу дакументаў з вядомым рэестрам дзяржаўнага архіва ВКЛ ад 26 лістапада 1623 г. дазваляе канстатаваць высокую ступень іх адпаведнасці [19, с. 31–32; 1, с. 252–263]. Згодна са зместам рэзалюцыі № 2 «Аб беларускіх архіўных фондах за межамі БССР», для якой артыкул М. В. Доўнар-Запольскага выступаў інфармацыйнай базай, «Публічная бібліятэка ў Ленінградзе» аднесена да месцаў, на матэрыялы якіх распаўсюджвалася «пажаданьне аб выкананьні звароту… у як найхутчэйшым часе (архіўныя фонды, што датычац-

ца Беларусі, дакументы і кнігі старых беларускіх архіваў)» [19, с. 5–6]. Такім чынам, відавочна, што прафесар М. В. Доўнар-Запольскі адназначна трактаваў названыя дзяржаўна-прававыя акты ВКЛ нават у форме копіі як частку беларускай архіўнай спадчыны[10].

Абгрунтаванне з’ездам такой трактоўкі матэрыялаў публічнай бібліятэкі пацвярджаецца наступным. Аналіз спісу, прыведзенага М. В. Доўнар-Запольскім, сведчыць, што гэта быў пераважна той масіў дакументаў бібліятэкі, які даследчыкамі ўжо другой паловы XX ст. ідэнтыфікаваны як «архіўная радзівіліяна» – частка фамільных збораў князёў Радзівілаў, якая ў пачатку XIX ст. трапіла на захоўванне ў Імператарскую публічную бібліятэку разам з калекцыяй першага загадчыка аддзела рукапісаў («Дэпо манускрыптаў») П. П. Дуброўскага (1754–1816) [22–24]. Сярод гэтых дакументаў знаходзіліся і асобныя акты з комплексу арыгіналаў дзяржаўнага архіва ВКЛ, якія яшчэ ў 1750-я гг. захоўваліся ў архіве Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў [25]. Ёсць падставы сцвярджаць, што радзівіліяна з калекцыі П. П. Дуброўскага паходзіла з Нясвіжа. Такая правеніенцыя некаторых рукапісаў была ўстаноўлена і самім М. В. Доўнар-Запольскім: па яго ацэнцы, «копіі Радзівілаўскага архіва» ў бібліятэцы дамінавалі ў агульным аб’ёме «дакументаў, якія адносяцца да Беларусі»[11].

Адметна, што акты, якія фігуруюць менавіта ў складзе комплексу арыгіналаў архіва ВКЛ, называе ў сваім дакладзе на Першым з’ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі таксама і Д. І. Даўгяла. Характарызуючы найбольш старажытныя і каштоўныя акты са складу Метрыкі ВКЛ, ён піша: «Ад старых часоў там захавалася ня дужа многа актаў, напрыклад: прысягі Карыбута (Зьмітро) Альгэрдавіча, Сьвідрыгайлы (Балеслава) Альгэрдавіча і інш., аб якіх ёсьць успаміны ў Мэтрыцы» [19, с. 54]. Гэтыя дакументы згаданы ў кнігах запісаў № 1 і № 2 Метрыкі ВКЛ сярод арыгіналаў у вопісе архіва ВКЛ 1570–1584 гг.[12] Ёсць падставы меркаваць, што яшчэ ў 1920-я гг. арыгінал першага з іх разам з некаторымі іншымі арыгіналамі актаў дзяржаўных архіваў ВКЛ і Каралеўства Польскага знаходзіўся ў публічнай бібліятэцы ў Ленінградзе, адкуль быў выдадзены Польшчы. Відавочна, што аднясенне актаў да каштоўных і шкадаванне аб невялікай іх колькасці ў Метрыцы ВКЛ сведчаць аб важнасці ва ўяўленні вучонага і саміх арыгіналаў.

Акрамя палажэнняў, якія датычыліся расійскіх архіваў, з’ездам былі сфармуляваны прэтэнзіі і да Польшчы ў частцы матэрыялаў менавіта XV–XVIII стст., «якія па сваім афіцыяльным пахаджэньні належаць да старых беларускіх архіваў». Спіс канкрэтных сховішчаў уключаў пераважна архівы і бібліятэкі Варшавы і Вільні і меў асновай даклад М. В. Доўнар-Запольскага. Просьба аб пастаноўцы пытання аб іх звароце накіроўвалася ва ўрад БССР. З’езд таксама прыняў важнае рашэнне аб унясенні ва ўрад Беларусі прапановы дэлегаваць прадстаўніка ў склад савецкай камісіі аб вяртанні Польшчы архіўных дакументаў згодна з артыкулам XI Рыжскай дамовы аб міры (у склад камісіі ўваходзіў прадстаўнік Украіны).

Апісаныя вышэй намаганні як навуковай, так і савецкай дзяржаўнай эліты Беларусі мелі свой плён. Зрухі пачаліся яшчэ пасля з’езда архіўных работнікаў БССР 1924 г. і працэсаў першага ўзбуйнення Беларусі. Даследчыкі адзначаюць, што ўжо ў пачатку 1925 г. з Расіі на Беларусь некаторыя фонды вярнуліся (дакументы фонду Мінскай духоўнай кансісторыі). Больш актыўна гэты працэс развіваецца ў другой палове 1925 – 1926 г. Маюцца звесткі аб вяртанні матэрыялаў Мураўёўскага музея ў Вільні, 25 скрынь з актавымі кнігамі былога Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг[13]. Аднак найбольш істотнае значэнне ў дадзеных працэсах мелі стварэнне камісіі пры ЦВК СССР па праблеме вяртання архіваў саюзным рэспублікам (пастанова Прэзідыума ЦВК СССР ад 18 верасня 1925 г.) і адпаведныя рашэнні рэспубліканскіх органаў улады (пастанова Прэзідыума ЦВК БССР ад 2 кастрычніка 1925 г.

---

[10]Знаходка была зроблела вучоным яшчэ ў 1890-я гг. Яе лёс і сучасны стан не высветлены.

[11]У прыведзеным М. В. Доўнар-Запольскім спісе пазначаны наступныя ўліковыя нумары і такі каментарый даследчыка: «Поль., F. IV, № 183. Лісты фаміліі Радзівілаў 1548–1689 гг.»; «Поль. F. IV, № 184–223. Копіі з Радзівілаўскага архіву ў Нясьвіжы»; «Рас., F. в. № 42. Копія рэвізіі Берасьцейскага староства 1566 г., на 305 л. з Радзівілаўскай бібліотэкі»; «Тое ж, № 85. Выпісы з Радзівілаўскага архіву»; «У Публічнай Бібліотэцы я мог прымеціць толькі вельмі нямногае, бо кароткі час займаўся ў ёй. Усё-ж такі відаць, што тут павінна быць шмат дакументаў, якія адносяцца да Беларусі, не гаворачы ўжо аб копіях Радзівілаўскага архіву» [19, с. 34–35].

[12]Wiernoscz Corybutowa. 1388. Dymitr alias Corybut kx. Litewski czyni hold naiasnieissemu kx. panu Wladislawowi Croliowi Polskiemu, bratu swemu milemu, i naiasnieissey Croliowey Jadwidze, malzonce iego, i ich potomkom, i Coronie Polskiei. Datum w Crakowie w poniedzialek swiąteczny. Pod pieczęcią. Littera D.»; «[Wi]ernoscz Swidrygalowa. [1440. S]widrygal nawyssy wielki kx. litewski obieczuie i offiarue pod wiarą i podcziwosczią bycz wiernym naiassniessemu kx. Wladislawowi, z bozey laskj Croliowi Polskiemu i Ellectowi Kroliestwa Więgierskiego i iego bratu rodzonemu panu Cazimierzowi i wsytkiey Radzie Coronney Polskiei i Ruskiei. A nigdy niebycz przecziwko niem ani moczą ani slowem, uczynkiem, potęznosczią, alie onym zawse sprawiedliwą i prawdziwą radę i possilek dodawacz, wedlie szwey moznosczi, czo obeczuie dobrą wiarą i podcziwosczią wiernie zdzierzecz. Datum w Tlumaczu, w poniedzialek po octawie Swięta cziala Bozego. Littera C [26, с. 325].

[13]Факт вяртання з Расіі ў другой палове 1920-х гг. актавых кніг судовых устаноў ВКЛ з былых Віцебскага і Віленскага цэнтральных архіваў старажытных актавых кніг да канца не высветлены. Няма дакладных звестак, што канкрэтна паступіла з г. Яраслаўля. У каталозе Дзяржаўнага архіўнага фонда БССР 1935 г. (неапублікаваны) актавыя кнігі судовых устаноў ВКЛ адсутнічаюць. Асноўная частка былога Віцебскага цэнтральнага архіва была вернута Літвой у БССР толькі ў 1960 г. [9, с. 92–94, 163–164].

аб вяртанні архіўных матэрыялаў з-за межаў БССР) [27, с. 25]. Камісія функцыянавала фактычна да пачатку 1927 г. Пазіцыя БССР адносна прэтэнзій на дакументы перыяду ВКЛ фармулявалася ў межах дзейнасці камісіі наступным чынам: прад'яўляць прэтэнзіі на «ўсе дакументы Вялікага княства Беларуска-Літоўскага, якія ня маюць адносін да УССР» (пратакол ад 14 кастрычніка 1925 г.) [12, с. 81–82; 5, с. 570–571]. На першапачатковым этапе дзейнасці камісіі (лістапад 1925 г.) праблема перадачы Метрыкі ВКЛ БССР знаходзіла разуменне. Працэс стрымлівала адсутнасць канчатковага рашэння ў адказ на прэтэнзіі Польшчы адносна гэтага фонду. У далейшым пытанне сустрэла вострую апазіцыю з боку дзеячаў Цэнтрархіва РСФСР і расійскіх вучоных. Цалкам спынілі ўзгаданыя працэсы стварэнне ў 1929 г. саюзнага органа па кіраванні архіўнай справай і распрацоўка норм аб канцэнтраванні ў саюзным цэнтры архіўных матэрыялаў «агульнасаюзнага значэння» (пастанова калегіі Цэнтральнага архіўнага ўпраўлення РСФСР ад 7 студзеня 1931 г.). Да такіх адносілася і Метрыка ВКЛ. Гэтыя падзеі не толькі зрабілі немагчымым вяртанне яе ў Беларусь, але сталі пачаткам адваротных працэсаў – перадачы ў цэнтральныя архівы СССР каштоўных матэрыялаў з архівасховішчаў саюзных рэспублік, у тым ліку з БССР [9, с. 95–113]. Канстатацыя Другой нарадай архіўных работнікаў Беларусі (19–24 снежня 1927 г., Мінск) факта вяртання Метрыкі ВКЛ як здзейсненага не адпавядае рэчаіснасці [27, с. 35, 68]. Згодна з прынятай пастановай аб Адзіным дзяржаўным архіўным фондзе БССР ад 28 мая 1927 г., у яго межах выдзяляліся чатыры асноўныя часткі. Самастойную катэгорыю ўтваралі «Старажытныя актавыя кнігі і дакументы перыяду да Рэчы Паспалітай». У канцы 1927 г. кіраўніцтва галіны, аднак, прызнавала наступнае: «Архивных материалов этой категории не так много, и они собираются в Могилёвском историческом архиве и образуют секцию “старадаўных дакумэнтаў”» [27, с. 40]. Такім чынам, пераважна вярталіся матэрыялы ўстаноў Расійскай імперыі [12, с. 29–30]. Актаў органаў улады перыяду ВКЛ і Рэчы Паспалітай у 1920-я гг. амаль не паступіла.

У кантэксце вышэйапісанага для разгляду ўзнятай тэмы важнае значэнне мае наступны факт. Матэрыялы дзейнасці камісіі ЦВК СССР па вяртанні архіваў саюзных рэспублік, а таксама нацыянальнай камісіі ўтрымліваюць каштоўныя звесткі аб заяўках беларускага боку на дакументы, што мелі ўскосныя адносіны да комплексу арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў архіва ВКЛ. Так, 16 лістапада 1925 г. на пасяджэнні падкамісіі М. В. Доўнар-Запольскім узнімалася пытанне «О грамотах удельных князей литовских», якія, па яго даных, захоўваліся ў былым архіве Міністэрства замежных спраў, у фондзе так званага «Древлехранилища» (пункт 18)[14]. Гэта ж ці падобная пазіцыя названа і ў адным з чатырох больш дэтальных спісаў, якія ў працэсе працы камісіі былі падрыхтаваны беларускім бокам на аснове агульнага спіса, што складаўся з 68 пазіцый: «3. Грамоты Вел(икого) Кн(яжества) Литовского, переданные при перевозке Литовской Метрики из Сената в Московский архив М(инистерства) Юст(иции)» [12, с. 91]. Адметна, што гэты пункт у спісе змешчаны сярод першых і побач з пунктам «2. Архивный фонд Метрики Литовской». Вядома, што ў дзяржаўных архівах ВКЛ і Каралеўства Польскага захоўваліся акты прысягі шэрагу князёў ВКЛ у вернасці каралю польскаму Уладзіславу-Ягайлу і каралеве Ядвізе канца XIV – пачатку XV ст. Асноўная іх маса ўваходзіла ў склад так званага Архіва скарбца кароннага (Каралеўства Польскага), што пацвярджаецца адпаведнай уліковай дакументацыяй архіва, у тым ліку знакамітым вопісам М. Кромера 1551 г. [28, с. 453–460]. Гэтыя дакументы ў канцы XVIII ст. былі вывезены ў Расію і змешчаны разам з Кароннай метрыкай пры трэцім дэпартаменце Сената ў Санкт-Пецярбургу. У пачатку XIX ст. частка іх была перададзена ў Імператарскую публічную бібліятэку, дзе і захоўвалася да XX ст.[15] Частка актаў, у тым ліку згаданых вышэй, верагодна, патрапіла ў «Древлехранилище», а пазней – у архіў Міністэрства замежных спраў Расіі. Адзінкавыя акты названай групы яшчэ ў 1551–1584 гг. пры нявысветленых абставінах апынуліся ў складзе дзяржаўнага архіва ВКЛ і ўпершыню былі зафіксаваны ў яго вопісе 1570–1584 гг. Архіўны лёс асобных з іх падзяліў гісторыю комплексу, якім з другой паловы XVII ст. завалодалі Радзівілы [26, с. 325; 1, дадатак]. Фармулёўка пытання ў разгледжаным праекце пратакола 1925 г. не дае дакладнага адказу на пытанне аб ступені ідэнтычнасці дакументаў. Аднак факт цікавасці да названай групы актаў выразна сведчыць аб атаясамленні іх айчыннымі спецыялістамі з нацыянальнай гістарычнай каштоўнасцю Беларусі. У красавіку 1927 г. Цэнтрархіў РСФСР канстатаваў факт перадачы заяўленых грамат Польшчы: «Грамоты Великого княжства Литовского (п. 3), вывезенные из Краковского архива, Российско-Украинской делегацией возвращены

[14]Дзяржаўнае сховішча старажытных хартый, рукапісаў і пячатак (рус. *Государственное древлехранилище хартий, рукописей и печатей*) створана ў Маскве ў 1851 г. як аддзел Збройнай палаты. У 1882 г. асноўная маса дакументаў увайшла ў склад Маскоўскага галоўнага архіва Міністэрства замежных спраў, зараз яны знаходзяцца ў складзе Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў.

[15]«Выписка из книги, хранящейся в Метрике при Канцелярии 3-го Департамента Сената, под следующим заглавием: Опись делам в картонах находящимся, составленная 1808 года, по старым Варшавским регистрам, с отметками, какия пиесы по сличении с теми же регистрами не оказались, какия остались в Метрике и какия выданы в Императорскую Библиотеку под росписку Кол(ежского) Сов(етника) Дубровского» [28, с. 457, 461–467].

в 1923 г. Польше вместе с Коронной метрикой, по принадлежности» [12, с. 96].

У наступным пункце размова, верагодна, ідзе аб матэрыялах нясвіжскага паходжання, якія былі выяўлены М. В. Доўнар-Запольскім у Імператарскай публічнай бібліятэцы (гл. вышэй): «21. О рукописных книгах, в частности, о копиях с документов из Несвижского архива Радзивиллов, сделанных Гильдебрантом, и о рукописных статутах, хранящихся в Рукописном отделении Ленинградской публичной библиотеки» [9, с. 100]. У спісах прэтэнзій беларускага боку гэтыя пазіцыі адлюстраваны так: «2. Копии документов из Несвижского архива Радзивиллов. 3. Рукописные списки Статута Вел. кн. Литовского…» [12, с. 94]. Дадзены пункт з'яўляецца адным з найбольш ранніх фактаў дэманстрацыі інтарэсу беларускай дзяржавы да матэрыялаў Нясвіжскіх збораў Радзівілаў і прэтэнзій на гэтыя дакументы. Іх актывізацыя адбудзецца пасля 1939 г., калі стане вядома аб вывазе Радзівіламі часткі Нясвіжскага архіва ў Варшаву. Абодва пункты названага спісу не былі рэалізаваны.

На жаль, падзеі ў самой БССР у канцы 1920-х – 1930-х гг. таксама не спрыялі вырашэнню праблемы вяртання архіўнай спадчыны ВКЛ. У лютым 1926 г., неўзабаве пасля Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, супраць вядучага яго ўдзельніка – М. В. Доўнар-Запольскага – разгарнулася ідэалагічная барацьба, якая скончылася яго высылкай з БССР. Яна была звязана з крытыкай партыйнымі органамі і забаронай публікацыі яго працы «Гісторыя Беларусі» [15, с. 44–49]. Кампанія супраць вучонага стала пачаткам паступовага згортвання прапанаваных ім і яго калегамі ініцыятыў. Пазней фактычна ўсе асноўныя дзеячы апісаных вышэй падзей у той або іншай ступені пацярпелі ад рэпрэсій. У 1930-я гг. дзейнасць па адстойванні законных правоў і інтарэсаў Беларусі ў галіне архіваў ставілася ў віну кіраўніцтву Цэнтрархіва БССР і кваліфікавалася як праяўленне «беларускага нацыяналізму», супрацiўленне цэнтралізацыі архіўнай справы ў СССР [29, с. 17]. Прэтэнзіі на Метрыку ВКЛ сталі выступаць злачынствам, таму што былі выразным пасяганнем на фонды агульнасаюзнага значэння. Падпарадкаванне з 1938 г. архіўнай сістэмы БССР Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў было адлюстраваннем тэндэнцый таталітарызму і праследавання нацыянальных рухаў ва ўнутранай палітыцы кіраўніцтва СССР[16]. Праблемы вяртання архіўнай спадчыны саюзных рэспублік гэтай палітыцы не адпавядалі. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, 29 сакавіка 1941 г., было прынята Палажэнне аб дзяржаўным архіўным фондзе СССР, якім зацвярджалася сетка цэнтральных архіваў СССР, чым канчаткова замацоўваўся іх профіль як установ з матэрыяламі агульнасаюзнага значэння. Адпаведна, вяртанне актаў высокай навуковай і гісторыка-культурнай каштоўнасці саюзным рэспублікам гэтаму прынцыпу супярэчыла. У 1960-я гг. прадстаўнікі кіраўніцтва архіўнай галіны СССР заяўлялі наступнае: «…вопрос о Литовской Метрике давно решен и в будущем к нему не следует возвращаться ни в письменном, ни в устном виде» [30, с. 33].

Вяртанне Метрыкі ВКЛ на Беларусь адбылося толькі ў 1992 г. Яна была вернута ў форме копій, выкананых на аснове тэхнікі мікрафільмавання. Аб завяршэнні праекта прадстаўнікамі дзяржаўнай архіўнай службы было паведамлена 28 студзеня 1992 г. на адным з пасяджэнняў камісіі «Вяртанне». Мікрафільмы (пазітывы) – 663 адзінкі захоўвання – з фонду № 389 Цэнтральнага дзяржаўнага архіва старажытных актаў былі ўключаны ў склад Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) у выглядзе калекцыі «КМФ-18»[17]. Айчынны даследчык М. Ф. Шумейка адзначае, што выраб копій адбываўся за кошт беларускага боку, у фінансавым выражэнні ён аказаўся дастаткова значным [9, с. 200, 202]. Важную ролю ў здзяйсненні гэтага сапраўды эпахальнага для краіны праекта адыграў тагачасны начальнік Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, а з 15 кастрычніка 1992 г. – кіраўнік Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь А. М. Міхальчанка – адзін са стваральнікаў першага ў рэспубліцы самастойнага гісторыка-архівазнаўчага аддзялення на гістарычным факультэце БДУ.

## Заключэнне

Такім чынам, у 1920-я гг. страчаная архіўная спадчына Беларусі і, у прыватнасці, Метрыка ВКЛ разглядалася кіраўніцтвам краіны, яе інтэлектуальнай элітай як важны элемент у працэсах дзяржаўнага будаўніцтва БССР. Асноўная роля ў ініцыяванні яе вяртання, навуковым абгрунтаванні, арганізацыйным і інфармацыйным суправаджэнні яго здзяйснення належала прафесарска-выкладчыцкаму складу і кіраўніцтву Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Рэалізацыя дадзенай ідэі аказалася немагчымай па прычыне змены пазіцыі саюзнага кіраўніцтва па гэтым пытанні, што ў значнай

[16]27 верасня 1938 г. была прынята пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб перадачы архіўных устаноў краіны пад кіраўніцтва НКУС. У складзе гэтага ведамства і яго правапераемнікаў дзяржаўныя архівы знаходзіліся да 1960 г.

[17]НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Прадмова да вопісу. Першай вяртання Метрыкі ВКЛ у форме копій, выкананых на аснове тэхнікі мікрафільмавання, здолела дабіцца ў 1967–1983 гг. Літоўская ССР (пазітывы і негатывы) [30, с. 39–40].

ступені было абумоўлена працэсамі цэнтралізацыі ў архіўнай галіне СССР у канцы 1920-х гг., а пазней – палітыкай згортвання беларусізацыі. Як падаецца, негатыўны ўплыў на працэс вяртання айчынных архіваў і яго вынікі мела таксама высылка з Беларусі ў 1926 г. прафесара БДУ М. В. Доўнар-Запольскага.

Пытанне вяртання ў той або іншай форме комплексу арыгіналаў дзяржаўна-прававых актаў у разглядаемы перыяд не фармулявалася як самастойнае па прычыне недастатковасці інфармацыі аб гісторыі і месцазнаходжанні комплексу, яго статусе як часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ. Аднак вялікае навуковае і гісторыка-культурнае значэнне асобных актаў комплексу, а таксама цэлых іх відаў выразна прасочваецца ў кантэксце апісання складу Метрыкі ВКЛ, а пытанне вяртання актаў на Беларусь закранаецца ў дакументах, прысвечаных вяртанню архіўных матэрыялаў айчыннага паходжання ў цэлым, і дакументаў архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у прыватнасці. Да цяперашняга часу дзяржаўныя архівы Беларусі не маюць у сваіх фондах ніводнага акта са складу названага комплексу, нават у форме копій. Выключэннем з'яўляюцца тэксты асобных актаў у складзе Метрыкі ВКЛ (НГАБ, мікрафільмаваная копія).

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Латушкін АМ. Рэестр дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ад 26 лістапада 1623 г. і яго значэнне для рэканструкцыі складу комплексу арыгіналаў актаў кан. XIV – пач. XVII стст. *Беларускі археаграфічны штогоднік.* 2017;18:247–264.

2. Рыбакоў АЯ. Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага ў канцы XVI ст. *Архівы і справаводства.* 1999;2:70–76.

3. Ptaszycki S. Gdzie się przechowywały i przechowują obecnie akta unii Litwy z Polską? *Kwartalnik historyczny.* 1902;16(1):589–591.

4. Латушкін АМ. Дзяржаўныя акты Вялікага княства Літоўскага ў складзе Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў: стан і накірункі даследавання праблемы. У: Дзейчык НМ, Жумар СУ, Пазнякоў ВС і інш., рэдактары. *Мінулае і сучаснасць: архівы ў сістэме гуманітарных ведаў: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю Віцебскай вучонай архіўнай камісіі; Мінск, Беларусь; 20 мая 2009 г.* Мінск: БелНДІДАС; 2010. с. 31–37.

5. Доўнар-Запольскі МВ. *Выбранае.* Мінск: Беларуская навука; 2017. 668 с.

6. Шумейка МФ. Гісторыка-прававыя і маральна-этычныя аспекты рэстытуцыі ў адносінах да беларускіх архіваў. *Архівы і справаводства.* 2000;4:91–100.

7. Пичета ВИ. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. (исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). В: Копысский ЗЮ, редактор. *В. И. Пичета*. Москва: Издательство АН СССР; 1961. 812 с.

8. Абламейка СУ, рэдактар. *Памяць і слава. Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – Уладзімір Іванавіч Пічэта.* Мінск: БДУ; 2011. 375 с.

9. Шумейко МФ. *Исторические и правовые аспекты реституции белорусских архивов.* Минск: БелНИИДАД; 2013. 269 с.

10. Баранава АУ. І. Пічэта і станаўленне архіўнай справы ў Беларусі ў 1920-я гг. *Архівы і справаводства.* 2007;3: 90–94.

11. Шумейко МФ, редактор. *Первая всебелорусская конференция архивных работников 12–15 мая 1924 г. Документы и материалы.* Минск: БелНИИДАД; 1999. 147 с.

12. Шумейко МФ. *Собрать рассеяное.* Минск: БелНИИДАД; 1997. 153 с.

13. Стражаў ВІ, рэдактар. *Памяць і слава. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1941.* Мінск: БДУ; 2006. 383 с.

14. Шумейко МФ. «Имеет мало организаторов ему равных»: к 150-летию со дня рождения М. В. Довнар-Запольского. *Беларуская думка.* 2017;6:90–98.

15. Унучак АУ. «Мы ёсьць народам»: М. В. Доўнар-Запольскі ў апошні перыяд жыцця і творчасці (1918–1934 гг.). У: Груша АІ, Аляхновіч РА, рэдактары. *Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах.* Мінск: Беларуская навука; 2009. с. 28–49.

16. Лебедзева ВМ, рэдактар. *Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі: біябібліяграфічны паказальнік.* 2-е выданне, дапоўненае. Мінск: БелНДІДАС; 2007. 168 с.

17. *Савецкая Беларусь.* 1925. 24 снежня. № 292.

18. Шумейко МФ. *Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло.* Минск: БелНИИДАД; 2002. 165 с.

19. *З'езд даследчыкаў беларускай археалогіі. Працы Першага з'езда даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі, 17–18 студзеня 1926 г.* Мінск: Інбелкульт; 1926. 86 с.

20. Даўгяла ДІ. Літоуская мэтрыка. *Савецкая Беларусь.* 1926. 29 студзеня. с. 6–7.

21. Даўгяла ДІ. *Літоўская Мэтрыка і яе каштоўнасьць для вывучэньня мінуўшчыны Беларусі.* Рыга: Беларускае выдавецтва ў Латвіі; 1933. 14 с.

22. Копреева ТН. Обзор польских рукописей Государственной Публичной Библиотеки (Собрание П. П. Дубровского). *Труды Государственной публичной библиотеки имени М. Е. Салтыкова-Щедрина.* 1958;V(8):137–165.

23. Воронова ТП. Материалы к биографии П. П. Дубровского. В: *Источниковедческое изучение памятников письменной культуры: сборник научных трудов.* Ленинград: Государственная публичная библиотека; 1984. с. 120–130.

24. Кром ММ, редактор. *Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Том VI. Радзивилловские акты из собрания Российской национальной библиотеки: первая половина XVI в.* Москва, Варшава: Древлехранилище; 2002. 267 с.

25. Латушкін АМ. Акт перамір'я паміж Расійскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім 1556 г. з Расійскай нацыянальнай бібліятэкі: пытанні правеніенцыі. В: Дулов АН, Румянцева МФ. *Актуальные проблемы источниковедения:*

*материалы IV Международной научно-практической конференции к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права; г. Витебск, Беларусь; 20–21 апреля 2017 г.* Витебск: ВГУ имени П. М. Машерова; 2017. с. 160–163.

26. Шамбинаго СК, Бережков НГ, редакторы. *Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском архиве Министерства юстиции. Книга 21. Книги Литовской метрики. Часть XXVIII.* Москва: Товарищество Скоропечатни А. А. Левенсон; [1915, 1916]. 592 с.

27. Шумейко МФ, редактор. *Второе совещание архивных работников Беларуси, 19–24 декабря. 1927 г.* Минск: БелНИИДАД; 2001. 73 с.

28. *Книга посольская Метрики Великого Княжества Литовского, содержащая в себе дипломатическия сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда-Августа (с 1545 по 1572 год)…* Москва: Университетская типография; 1843. 480 с.

29. Шумейка МФ. Цяжкі шлях вяртання. Намаганні беларускага нацыянальнага актыву дзеля звароту ў Беларусь архіўнай спадчыны ў 1920-я гг. *Спадчына.* 1998;6:10–24.

30. Ягелявичюс С. О том, каким образом микрофильмы Литовской Метрики оказались в Литве. *Новости Литовской Метрики.* 1999;3:32–40.

## References

1. Latushkin AM. [Register of State Archives of the Grand Duchy of Lithuania on 26 November 1623 and its significance for the reconstruction of the original composition of the complex acts of the late XIV – early XVII century]. *Belaruski arheagrafichny shtogodnik.* 2017;18:247–264. Belarusian.

2. Rybakou AYa. [Organization of the Grand Duchy of Lithuania in the state archive of the XVI century]. *Arhivy i spravavodstva.* 1999;2:70–76. Belarusian.

3. Ptaszycki S. Gdzie się przechowywały i przechowują obecnie akta unii Litwy z Polską? *Kwartalnik historyczny.* 1902;16(1):589–591. Polish.

4. Latushkin AM. [Public acts of the Grand Duchy of Lithuania as a part of Nesvizh archive of the Radziwill Princes: the status and direction of the research problem]. In: Dzeichyk NM, Zhymar SU, Paznjakow VS, editors. *Minulae i suchasnasc': arhivy w sistjeme gumanitarnyh vedaw: matjeryjaly mizhnarodnaj navukovaj kanferjencyi, prysvechanaj 100-goddzju Vicebskaj vuchonaj arhiwnaj kamisii; Minsk, Belarus'; 20 maja 2009 g.* [The past and present in the archives of human knowledge system: materials of the International scientific conference dedicated to the 100th anniversary of the Viciebsk scientific archive commission; Minsk, Belarus; 20 May 2009. Minsk: Belaruski navykova-dasledchy instytut dakumentaznawstva i archiwnaj spravy; 2010. p. 31–37. Belarusian.

5. Dounar-Zapol'skiy MV. *Vybranae* [Favorites]. Minsk: Belaruskaya navuka; 2017. 668 p. Belarusian.

6. Shumejka MF. [Historical, legal and ethical aspects of restitution against the Belarusian archives]. *Archivy i spravavodstva.* 2000;4:91–100. Belarusian.

7. Picheta VI. [Byelorussia and Lithuania of the XV–XVI centuries (studies on the history of socio-economic, political and cultural development)]. In: Kopysskii ZYu, editor. *V. I. Picheta* [V. I. Picheta]. Moscow: Academy of Sciences of the USSR; 1961. 812 p. Russian.

8. Ablameika SU, editor. *Pamjac' i slava. Pershy rjektar Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta – Uladzimir Ivanavich Pichjeta* [Memory and Glory: The first rector of the Belarusian State University – Vladimir Picheta]. Minsk: Belarusian State University; 2011. 375 p. Belarusian.

9. Shumeyko MF. *Istoricheskie i pravovye aspekty restitutsii belorusskikh arkhivov* [Historical and legal aspects of the restitution of Belarusian archives]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2013. 269 p. Russian.

10. Baranava AU. [Picheta and establishment of archives in Belarus in the 1920s.] *Archivy i spravavodstva.* 2007;3:90–94. Belarusian.

11. Shumeyko MF, editor. *Pervaya vsebelorusskaya konferentsiya arkhivnykh rabotnikov 12–15 maya 1924 g. Dokumenty i materialy* [First All-Belarusian Conference of Archival Workers May 12–15, 1924. Documents and materials]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 1999. 147 p. Russian.

12. Shumeyko MF. *Sobrat' rasseyanoe* [Collect the scattered]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 1997. 153 p. Russian.

13. Strazhaw VI, editor. *Pamjac' i slava. Belaruski dzjarzhawny wniversitjet. 1921–1941* [Memory and Glory. The Belarusian State University. 1921–1941]. Minsk: Belarusian State University; 2006. 383 p. Belarusian.

14. Shumeyko MF. [«It has few organizers to it»: on the 150th anniversary of the birth of M. V. Dovnar-Zapolskiy]. *Belaruskaya dumka.* 2017;6:90–98. Russian.

15. Unuchak AU. [«We have people»: M. V. Dounar-Zapolskiy in the last period of life and creativity (1918–1934.)]. In: Grusha AI, Alyahnovich RA, editors. *Dzjarzhawnaja gaspadarka Vjalikaga knjastva Litowskaga pry Jagelonah* [Granddaughters of the state economy of the Grand Duchy of Lithuania at the Jagiellonian]. Minsk: Belaruskaya navuka; 2009. p. 28–49. Belarusian.

16. Lebedzeva VM, editor. *Mitrafan Viktaravich Downar-Zapol'ski: bijabiblijagrafichny pakazal'nik* [Mitrafan Dounar-Zapol'sky: bibliographic index]. 2nd edition, added. Minsk: Belaruski navykova-dasledchy instytut dakumentaznawstva i archiwnaj spravy; 2007. 168 p. Belarusian.

17. *Savietskaya Belarus* [Soviet Belarus]. 1925. December 24. No. 292. Belarusian.

18. Shumeyko MF. *Arkhivist i arkheograf Dmitrii Ivanovich Dovgyallo* [Archivist and archeographer Dmitry Ivanovich Dovgyallo]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2002. 165 p. Russian.

19. *Z'ezd dasledchykaw belaruskaj arhealogii. Pracy Pershaga z'ezda dasledchykaw belaruskaj arhealogii i arheagrafii, 17–18 studzenja 1926 g.* [The work of the First Congress of Belarusian researchers and archeology archeography, 17–18 January 1926]. Minsk: Inbelkult; 1926. 86 p. Belarusian.

20. Dawgjala DzI. [Lithuanian Metrics]. *Savietskaya Belarus*. 1926. January 29. p. 6–7. Belarusian.

21. Dawgjala DI. *Litowskaja Mjetryka i jae kashtownas'c' dlja vyvuchjen'nja minuwshchyny Belarusi* [Lithuanian Metrics and its value to the study of the past of Belarus]. Riga: Belaruskaye vydavectva w Latvii; 1933. 14 p. Belarusian.

22. Kopreeva TN. [Review of Polish manuscripts of the State Public Library (Collection of P. P. Dubrovsky)]. *Trudy Gosudarstvennoi publichnoi biblioteki imeni M. E. Saltykova-Shchedrina.* 1958(8):137–165. Russian.

23. Voronova TP. [Materials to the biography of P. P. Dubrovsky]. In: *Istochnikovedcheskoe izuchenie pamyatnikov pis'mennoi kul'tury: sbornik nauchnykh trudov* [Source study of written culture monuments: collection of scientific works]. Leningrad: Gosudarstvennaya publichnaya biblioteka; 1984. p. 120–130. Russian.

24. Krom MM, editor. *Pamyatniki istorii Vostochnoi Evropy. Istochniki XV–XVII vv. Tom VI. Radzivillovskie akty iz sobraniya Rossiiskoi natsional'noi biblioteki: pervaya polovina XVI v.* [Monuments of Eastern Europe. Sources XV–XVII centuries. Volume. VI: The Radziwill Acts from the Collection of the National Library of Russia: first half of the XVI century]. Moscow; Warsaw: Drevlekhranilishche; 2002. 267 p. Russian.

25. Latushkin AM. [Act armistice between the Russian state and the Grand Duchy of Lithuania in 1556 from the National Library of Russia: questions provenance]. In: Dulov AN, Rumyntseva MF, editors. *Aktual'nye problemy istochnikovedeniya: materialy IV Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii k 420-letiyu darovaniya gorodu Vitebsku magdeburgskogo prava; g. Vitebsk, Belarus', 20–21 aprelya 2017 g.* [Actual problems of source. Materials IV International scientific-practical conference dedicated to $420^{th}$ anniversary gift of Magdeburg law to the city of Vitebsk; Viciebsk, Belarus; 20–21 April 2017]. Viciebsk: Viciebsk State University named after P. M. Masherov; 2017. p. 160–163. Belarusian.

26. Shambinago SK, Berezhkov NG, editors. *Opisanie dokumentov i bumag, khranyashchikhsya v Moskovskom arkhive Ministerstva yustitsii. Kniga 21. Knigi Litovskoi metriki. Chast' XXVIII* [Description of documents and papers stored in the Moscow archive of the Ministry of Justice]. Moscow: Tovarishchestvo skoropechatni A. A. Levenson; [1915, 1916]. 592 p. Russian.

27. Shumeyko MF, editor. *Vtoroe soveshchanie arkhivnykh rabotnikov Belarusi, 19–24 dekabrya. 1927 g.* [The second meeting of the Archives of Belarus employees, 19–24 December 1927]. Minsk: Belorusskii nauchno-issledovatel'skii institut dokumentovedeniya i arkhivnogo dela; 2001. 73 p. Russian.

28. *Kniga posol'skaya Metriki Velikogo Knyazhestva Litovskogo, soderzhashchaya v sebe diplomaticheskiya snosheniya Litvy v gosudarstvovanie korolya Sigizmunda-Avgusta (s 1545 po 1572 god)…* [The ambassadorial book, Metrics of the Grand Duchy of Lithuania, containing diplomatic relations between Lithuania and the state of King Sigismund-August (from 1545 to 1572) … Moscow: Universitetskaya tipografia; 1843. 480 p. Russian.

29. Shumejka MF. [Hard way return. The efforts of the Belarusian national asset for the conversion to Belarus archival heritage in the 1920s]. *Spadchyna*. 1998;6:10–24. Belarusian.

30. Jageljevičius S. [About the way the microfilms of the Lithuanian Metric turned out to be in Lithuania]. *Novosti Litovskoi Metriki*. 1999;3:32–40. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 10.10.2018.*
*Received by editorial board 10.10.2018.*